Такія старыя, што пра іх
Нічога не знаюць
І павівальныя бабкі [3, с. 305].

Руіны замка, рыцарскі этыкет, цікавасць да лёсу Баяна, Гусоўскага, Скарыны – дэталі, што характарызуюць У. Караткевіча як асобу пісьменніка. Сваё разуменне Паўлюка Багрыма як чалавека-змагара выказаў М. Танк у вершы «Багрым» (1986): змагарныя матывы паэзіі перайшлі ў яго кавальскую працу, таму Багрым спачатку куе люстру, якая будзе рассейваць змрок, каб Бог мог лепш бачыць людскія крыўды, калі Бог не пакарае крыўдзіцеляў народа, то Багрым да канца свайго жыцця:

Сякеры толькі будзе куць,
Якія путы рассякуць.
І будзе песні зноў складаць
І клікаць волю здабываць… [4, с. 68]

«Гутарку з Т. Бароўскім» (1993), якога Танк атэстуе «паэтам шляхоў-дарог, пакутлівых і незваротных» [4, с. 195], пранізвае пытанне-атэстацыя сваёй і суразмоўцы творчасці:

Ці быў патрэбен у баю
Наш хрыплы спеў з крывёй у горле? [4, с. 195]

Літаратурна-герменеўтычны вектар у лірыцы Максіма Танка накіраваны на выяўленне ўласных мастацкіх імператываў, дзе на першае месца выходзілі непарыўная сувязь з жыццём і творчы эксперымент як эстэтычны прынцып і варыянт ацэнкі сябе самога, літаратурных папярэднікаў і сучаснікаў.

**Літаратура**

1. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – Т. 1 : вершы (1930–1939). – 374 с.
2. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – Т. 4 : вершы (1964–1972). – 384 с.
3. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – Т. 5 : вершы (1972–1982). – 448 с.
4. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – Т. 6 : вершы (1983–1995). – 454 с.

*Т. П. Барысюк (Беларусь)*

## ІДЭЙНА-ЖАНРАВЫЯ ПОШУКІ Ў ПАЭЗІІ МАКСІМА ТАНКА (1986–1995)

Як вядома, спектр ідэйных і жанрава-тэматычных пошукаў Максіма Танка вельмі разнастайны, што вынікае са шматграннасці яго творчага таленту і духоўна-маральнай велічы асобы. Заяўленыя ў назве храналагічныя рамкі творчасці паэта адпавядаюць сучаснаму перыяду развіцця беларускай літаратуры, якія мы даследуем.

У вершы «Знойдзены…» М. Танк выказвае ідэю неўміручасці твораў геніяў мастацтва і літаратуры (Рафаэля, Бетховена, Пушкіна). А ў вершы «Гравюры Скарыны» – ідэю бессмяротнасці гэтых твораў мастацтва славутага беларускага першадрукара. Лірычны герой здзіўляецца: «І сёння / Нейкая чароўная / Жыве ў іх сіла, / Якая сляпым / Вяртае зрок, / Глухім – іх слых, / Няпомнячым – іх памяць, / А без’языкім – мову» [1, с. 72]. Песня, паводле меркавання лірычнага героя, загараецца «ад сонца ў сэрцы» [1, с. 154] («Песня»). Гэта ідэя натхняльнай сутнасці перажыванняў чалавека-творцы.

Персанаж дзіця з верша «І чаго» вывучае свет, паўзучы на вуліцу, лезучы на плот, цягнучыся да агню, што непакоіць бацькоў. І аўтар робіць ідэйную выснову: «…у жыцці / Усе самыя цікавыя адкрыцці – / За межамі / Забароненага» [1, с. 58].

Мы заўважылі цікавасць М. Танка да містычнай тэматыкі. Яна «адзіўляе» («адзіўленне» – тэрмін Б. Шклоўскага) успрыманне твора, вылучаючы яго сярод пераважна рэалістычных і бытапісальных твораў, дадае шарм эстэтыкі незвычайнага, чароўнага. Так, напрыклад, у вершы «Прыкметы» лірычны герой згадвае бабку Антаніну як анейролага і прагназіста: «…Хоць грамацеяў шмат, / Ніхто не ўмее, як яна, / Сон разгадаць, / Дакладна / Прадказаць надвор'е» [1, с. 62]. У іншым вершы пра будучую сустрэчу лірычнага героя з яго каханай распавяла цыганка («Вядома, што толькі…»). Надзвычайнымі гаючымі здольнасцямі валодае матчына малітва, «…якая не раз / Вяртала мяне / Нават з-за свету» [1, с. 137] («Звычайна, калі адпраўляюся…»). Лірычны герой просіць нашчадкаў пахаваць яго з яго прафесійнай прыладай – пяром, «…каб напісаў я вам пра тое, / Што ўсіх чакае на тым свеце» [1, с. 82] («Я помню»). І ў гэтых радках ёсць ідэя неўміручасці сапраўднага паэта, які і на тым свеце не губляе здольнасці паведамляць аб сваіх думках, пачуццях і падзеях. Ідэя суб'ектыўнасці ўспрымання часу таксама можа выглядаць дзівоснай. Так, лірычны герой верша «Працягласць дня і ночы» лічыў, што вясковыя дзяўчаты маглі «…і дзень укараціць, / і ноч прадоўжыць, / …і ашчаслівіць / На ўсё жыццё» [1, с. 89]. У гэтых радках гучыць таксама ідэя незвычайнай эмацыянальна-энергетычна натхняльнай сутнасці беларускіх дзяўчат.

Апошнім часам прынята разглядаць горад семіятычна – як тэкст, з яго прыродным і архітэктурным пейзажам, з людзьмі і жывёламі на плошчах і вуліцах, як непаўторнае месца са сваёй энергетыкай. Такім паўстае славуты кірмаш Мінска ў вершы М. Танка «Камароўская хроніка» – як знакавае і запамінальнае месца сталіцы. Напачатку верша, у якасці прэамбулы, лірычны герой слушна заўважае: «У кожным горадзе / Ёсць свае Манпарнасы, / Арбаты, / Брадвеі, / Праслаўленыя паэтамі, / Мастакамі, музыкантамі, / Турыстамі, / Піжонамі і снобамі» [1, с. 95]. Гэта месца ўражвае лірычнага героя яго гаманлівымі наведвальнікамі, пахамі рознакаляровай садавіны і агародніны, а таксама скульптурнай кампазіцыяй з Якубам Коласам і персанажамі яго твораў непадалёку ад кірмаша.

«Лемантар» М. Танка – алфавітны верш. На кожную літару, акрамя «й» і «ь», у алфавітным парадку пералічваюцца беларускія словы. Гучыць ідэя лемантара як «ключа ад скарбаў нашай / Мовы матчынай» [1, с. 209].

У «Эпітафіі на валуне» выказваецца ідэя магчымай небяспекі ад месца, дзе пахаваны злыдзень. У «Эпітафіі» закладзена ідэя, што Хлус застаецца самім сабой і пасля смерці: ён мог выкруціцца і ад яе. Вершы «Тост за пагоду» і «Тост» адпавядаюць маўленчаму жанру тоста, бо ў іх гаворыцца, за каго лірычны герой хоча падняць чарку: у першым вершы – за надвор'е, якое паспрыяла яго сустрэчы з каханай, у другім – за светлую будучыню Беларусі («…каб больш ніколі / Сонца не гасілі хмары…») [1, с. 287].

М. Танк у 1994 годзе напісаў нізку хоку, у якіх дамінуе тэма «чалавек і прырода». Хоку як японская цвёрдая форма верша адлюстроўвае ўсходнюю філасофію, часцей за ўсё будызм: «Рэкі, як людзі, / Спяшаюцца да акіяна – / Сваёй нірваны» [1, с. 317]. Многія людзі Усходу лічаць важным дасягнуць нірваны як медытатыўнага стану адсутнасці пакутаў і стрэсаў. У гэтым вершы ёсць адступленне ад цвёрдай формы хоку: у другім радку – 9 складоў, а не 7. «Над Фуджыямай – / Драконы бліскавіц. / Цвіце сакура» [1, с. 318]. У гэтым вершы можна выявіць ідэю неўміручасці прыгажосці ў небяспечным свеце. Тут абыгрываюцца традыцыйныя вобразы ўсходняй паэзіі – вобраз дракона як сімвал сілы і мужнасці і вобраз сакуры як сімвал прыгажосці. У гэтым вершы таксама ёсць адступленне ад цвёрдай формы хоку: у другім радку 6 складоў замест 7.

Такім чынам, у паэзіі М. Танка сучаснага перыяду выказваюцца наступныя ідэі: неўміручасці геніяў мастацтва і літаратуры і іх твораў, натхняльнай сутнасці іх перажыванняў, адкрыццяў «за межамі забароненага», г.зн. праз ломку правілаў; містычныя магчымасці прадказання будучыні; гаючай здольнасці матчынай малітвы; суб'ектыўнасці ўспрымання часу, незвычайнай эмацыянальна-энергетычнай сутнасці беларускіх дзяўчат; горада як тэксту з яго найбольш адметнымі мясцінамі; лемантара як ключа да скарбаў роднай мовы; неабходнасці ўхвалення спрыяльнага лёсаноснага шанца і светлай будучыні Беларусі; магчымасці дасягнення нірваны і неўміручасці прыгажосці ў небяспечным свеце. Асноўныя паэтычныя формы, у якіх гэтыя ідэі ўвасоблены М. Танкам: алфавітны верш, эпітафія, тост, хоку і інш.

**Літаратура**

1. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – Т. 6 : вершы (1983–1995). – 454 с.

*Н. Л. Бахановіч (Беларусь)*

## ВОБРАЗ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТ.: ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Нягледзячы на факт прыналежнасці цэлага пласта твораў XIX ст. на польскай і рускай мовах да мастацтва слова Беларусі, цэласна і сістэмна вобраз Бацькаўшчыны ў іх не даследаваны. Разгляд акрэсленага праблемна-тэматычнага поля запатрабаваны і ў сувязі з тым, што, «мы не маем адпаведнай патрэбам часу навуковай канцэпцыі гісторыі беларускай самасвядомасці, філасофіі, айчыннай гісторыі, без чаго складана асэнсаваць шматлікія паасобныя факты гісторыі беларускай літаратуры» [1, с. 59]. Разгляд у дадзеным артыкуле тэарэтыка-метадалагічных аспектаў увасаблення вобраза радзімы выступіць адным з этапаў вялікага даследавання, якое будзе садзейнічаць узбагачэнню ведаў пра важныя старонкі айчыннай гісторыі і стане ўнёскам у паступовае стварэнне згаданай канцэпцыі. Актуальнасць акрэсленай тэмы складана пераацаніць: беларусы не так шмат ведаюць пра сваё мінулае, калі мець на ўвазе не глабальныя гістарычныя падзеі, а штодзённае жыццё чалавека. У кнізе «Прысутнасць былога» У. Мархель акцэнтуе неабходнасць пераадолення «крызісу самапазнання» праз асваенне ў навуковым дыскурсе вернутага да спрадвечнага чытача іншамоўнага пласта айчыннага мастацтва. Таму зварот да вобраза Бацькаўшчыны ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. дазволіць паглыбіць і ўзмацніць веданне беларусамі саміх сябе.

Даследуючы вобраз Бацькаўшчыны ў літаратуры разглядаемага перыяду, лагічна весці адлік ад падзелаў Рэчы Паспалітай, пасля якіх мелі месца знакавыя падзеі: пачынаючы ад вайны 1812 г. са спадарожнай ёй надзеяй на французскага імператара як вызваленца ад расійскага валадарання, працягваючы двума паўстаннямі 1831 і 1863–1864 гг. супраць улады ды завяршаючы станам агульнага грамадскага расчаравання. Пералічанае спрыяла асэнсаванню феномена радзімы і стымулявала развіццё пачуцця патрыятызму.

Беларускае пісьменства ў XIX ст. грунтавалася на сумяшчэнні некалькіх моўных сістэм, у першую чаргу польскай, якая мела жывую традыцыю ў галіне выяўлення і друкавання, і беларускай, што функцыянавала пераважна ў вуснай форме ў сялянскім асяроддзі. Часта беларускія словы, не маючы адпаведнікаў, захоўваюцца ў іншамоўных творах і тлумачацца ў каментарыях, аднак «будучы выяваю і носьбітам аднае ментальнасці, мова наўрад ці набывае дастаткова і паралельна рысы іншага светаўспрымання. Гэтаксама і менталітэт аднаго на-